га чалавека. У зах. сацыялогіі Д.к. быў сфармуляваны ў працах па гісторыі і сацыялогіі рэлігіі ням. даследчыка М.Вебера, дзе ён сцвярджаў, што характар і тэмпы развіцця грамадства залежаць ад дамінуючых у ім рэліг. каштоўнасцей. Найб. паслядоўна ідэі Д.к. сфармуляваны ў структурным функцыяналізме амер. сацыёлага Т.Парсанса. На бел. землях культура са стараж. часоў адыгрывала істотную ролю ў духоўным развіцці грамадства. Аднак былі і такія гіст. перыяды (напр., у 2-й пал. 17 — пач. 18 ст., у 1-й пал. 19 ст.), падчас якіх айчынная культура знаходзілася ў крызісным стане і не аказвала істотнага ўплыву на жыццядзейнасць тагачаснага бел. грамадства. *Э.С.Дубянецкі.*

**ДЭФІНІЦЫЯ** (ад лац. definitio тлумачэнне, азначэнне), дакладнае, лагічнае і сціслае тлумачэнне зместу слова, яго значэння і сэнсу. У тлумачальных слоўніках бел. мовы выкарыстоўваюцца наступныя тыпы Д.: кароткая фармулёўка значэння з указаннем найб. істотных яго прыкмет (*спакой* ‘стан цішыні, адсутнасць трывогі, хвалявання, шуму’); Д., што з’яўляецца сінонімам да рэестравага слова (*быльнік* ‘чарнобыль’); фармулёўка, якая раскрывае не толькі сэнс словаўтваральнай асновы, але і значэнне афіксаў (*бурэнне* ‘дзеянне паводле дзеяслова *бурыць*’); Д., якая падкрэслівае сэнсавую тоеснасць рэестравага слова з інш. лексічнымі адзінкамі (*вялікасць* ‘тое, што і *веліч*’); Д., якая не раскрывае сэнс слова, а толькі паказвае на яго граматычную сувязь са словам, тоесным па лексічным значэнні (*узяць* ‘закончанае да *браць*’). *Д.В.Дзятко.*

**ДЭ́ШНЕР** (Desznег) Саламея (1759, г. Беласток, Польшча — 20.3.1809), польская актрыса драмы і оперы, рэжысёр, антрэпрэнёр. Выконвала ролі маладых гераінь і субрэтак у драм. і оперных пастаноўках. У 1777—85 і 1790—94 працавала ў Варшаўскія тэатры (у 1778 выступіла ў першай польск. оперы «Ашчасліўленая галеча» М.Каменскага). З 1794 у Гродне, дзе ў 1802 стварыла першы пастаянны тэатр, якім кіравала да канца жыцця.